# Квітней, творчасць!

**На працягу сарака гадоў у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў збіраюцца на вучобу будучыя беларускія артысты, музыканты, мастакі, бібліятэкары, майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.**

15 кастрычніка выкладчыкі, выпускнікі і студэнты адзначылі юбілей сваёй навучальнай установы ў малой зале Палаца Рэспублікі. Падчас свята прагучала шмат віншаванняў і ўспамінаў, многія супрацоўнікі ўніверсітэта ўзнагароджаны граматамі.

А потым — канцэрт вядомых творчых калектываў універсітэта! Камерны хор «Дабравест» выканаў іскрыстае «Парыжскае танга», вакальны гурт «Універсум» уразіў сучаснай апрацоўкай беларускай народнай песні. Была прадстаўлена і сцэна са знакамітага мюзікла «Дуброўскі», створанага Кімам Брэйтбургам разам са студэнтамі БДУКіМа. Сфатаграфавацца з артыстамі і нават звярнуцца да іх з пытаннем можна было ў фае падчас прэв'ю-шоу. Для гасцей і ўдзельнікаў свята падрыхтавалі экспазіцыю лепшых студэнцкіх работ: кераміка, ручное ткацтва, аплікацыі саломкай, роспіс па тканіне.




Фота Кастуся Дробава.

*Акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр Каваленя віншуе рэктара Дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Юрыя Бондара з юбілеем навучальнай установы.*

**Чытайце на стар. 2**

# Квітней, творчасць!

Ва ўніверсітэце культуры і мастацтваў вучацца не толькі творцы, але і глыбакадумныя кніжнікі. Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі з удзячнасцю да сваіх колішніх педагогаў перадаў у дар БДУКіМ першыя тамы факсімільнага выдання «Кніжная спадчына Францыска Скарыны».

Цікавай часткай праграмы сталі віншаванні ад прадстаўнікоў іншых вышэйшых навучальных устаноў, якія рыхтуюць спецыялістаў па роднасных спецыяльнасцях. Выступоўцы прыгадалі кур'ёзныя гісторыі, звязаныя са сваімі творчымі прафесіямі і адзначылі высокія дасягненні калег.

Заслужаная артыстка Беларусі Алена Спірыдовіч нагадала, што веды — «гэта не мэта, а інструмент для пошуку жыццёвага сэнсу. Мэта кожнага чалавека — памнажаць дабро і любоў вакол сябе». Першы намеснік міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Вадзім Богуш адзначыў: «Пачуццё прыгожага вельмі значнае для людзей мастацтва. Прыгожыя справы, прыгожыя думкі, прыгожыя людзі — усё гэта асвятляе наша жыццё».



Фота Кастуся Дробава.

*Наведвальнікі ўрачыстага мерапрыемства знаёмяцца з фотавыстаўкай, прысвечанай гісторыі Дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.*

**Юлія ШПАКОВА**